За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 8 (91) Жнівень 2014 г.

Віцябчук скардзіцца на старшыню райсуду

Жыхар Віцебску Павал Тулубенскі зьвярнуўся з заявай у Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусі. У сваёй заяве ён просіць кіраўніцтва вышэйшай судовай інстанцыі краіны прыцягнуць да адказнасьці і адхіліць ад займаемай пасады старшыню суду Кастрычніцкага раёну Віцебску Яўгена Бурунова. На думку заяўніка, судзьдзя Буруноў вынес у дачыненьні да яго неправасуднае рашэньне па адміністрацыйнай справе.



Павал Тулубенскі

Апроч таго, Павал Тулубенскі настойвае на кампэнсацыі яму маральнай шкоды ў памеры 3 000 000 рублёў і вяртаньні грашовых сродкаў, выдаткаваных ім на аплату дзяржаўнай пошліны, у памеры 300 000 рублёў.

Прычынай звароту віцебчука ў ВС РБ паслужыла вынесеная ў красавіку 2014 году судовая пастанова. На думку заяўніка, яна было неабгрунтаванай і прадузятай. Згодна з гэтай пастановай, Тулубенскі быў прызнаны вінаватым у зьдзяйсьненьні правапарушэньня, прадугледжанага арт. 9.2 (паклёп) КаАП Рэспублікі Беларусь, і атрымаў штраф у памеры 20 базавых велічынь на суму 3 000 000 рублёў.

Павал Васільевіч упэўнены ў тым, што ніякіх законных падстаў для ўзбуджэньня адміністрацыйнага судаводзтва і вынясеньня названай судовай пастановы старшыня суду Буруноў ня меў. Судовае разьбіральніцтва ён палічыў прадузятым - судзьдзя ўзяў бок пацярпелага - С.А. Літвінчука, які зьяўляецца кіраўніком камэрцыйнай структуры ТДА «НВП Мера».

Спадар Тубуленский лічыць, што матывам паводзін судзьдзі зьяўляецца магчымая спроба запалохаць асоб, якія падпісалі абгрунтаваную калектыўную скаргу на адрас прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь Лукашэнкі на дзеяньні кіраўніцтва ТДА «НВП Мера», што парушаюць іх правы і законныя інтарэсы.

На пачатку ліпеня бягучага году пастановай старшыні Віцебскага абласнога суду Мікалая Хамічонка пастанова судзьдзі Бурунова ад 18 красавіка была скасаваная, а справа аб адміністрацыйным правапарушэньні ў дачыненьні да Тулубенскага спыненая. Старшыня абласнога суду матываваў сваё рашэньне тым, што на дзень вынясеньня пастановы судом першай інстанцыі мінуў тэрмін накладаньня адміністрацыйнага спагнаньня, вызначаны працэсуальным законам.

Павал Тулубенскі ўпэўнены: судзьдзя Буруноў ведаў пра тое, што тэрмін накладаньня адміністрацыйнага спагнаньня на яго скончыўся, але, у парушэньне закону, прыняў рашэньне на карысьць Літвінчука. Тым ня менш, нягледзячы на грубыя парушэньні закону з боку судзьдзі, старшыня абласнога суду не наважыўся належным чынам прарэагаваць на самавольства і беззаконьне, дапушчаныя яго падначаленым і не прыцягнуў яго да заслужанага пакараньня. Апошняя акалічнасьць і змусіла жыхара Віцебску зьвярнуцца з заявай у Вярхоўны суд.

Гэткія дзеяньні і паводзіны служак беларускай Фэміды дыскрэдытуюць судовую сыстэму краіны, зьніжаюць давер грамадзян да вынесеных судовых пастаноў, выклікаюць падазрэньне ў карупцыйнасьці і заангажаванасьці судзьдзяў, лічыць Павал Тулубенскі.

Савет Міністраў ня хоча зьвяртацца ў Канстытуцыйны суд

Некалькі дзясяткаў жыхароў Віцебску падпісаліся пад калектыўным лістом у Савет Міністраў з просьбай паспрыяць зьмене рашэньня Віцебскага гарвыканкаму №881 "Аб масавых мерапрыемствах у г. Віцебску" і ініцыяваць зварот у Канстытуцыйны суд для праверкі адпаведнасьці гэтага дакумэнту Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. **Абласны каардынатар руху "За свабоду" Хрыстафор Жаляпаў** атрымаў адказ.



Хрыстафор Жаляпаў

У адказе гаворыцца, што Прэзыдыюм Савету Міністраў прыняў рашэньне не накіроўваць просьбу аўтараў калектыўнага ліста ў Канстытуцыйны суд. Без усялякіх тлумачэньняў, - падкрэсьлівае Хрыстафор Жаляпаў. Актывіст таксама адзначае, што з Саўміну не адказалі на яшчэ адно пытаньне - пра тое, каб у межах сваёй кампэтэнцыі гэты орган самастойна ўнёс зьмены ў рашэньне Віцебскага гарвыканкаму, якое немагчыма выканаць:

"З часу прыняцьця рашэньня гарвыканкаму №881 у 2009 годзе грамадзкім актывістам не далі дазволу ні на адзін пікет, ні на адзін мітынг, ні на адзін сход. Бо мясцовыя ўлады патрабуюць, каб да заявак на акцыі ініцыятары прыкладалі дамовы на абслугоўваньне супрацоўнікамі міліцыі, ЖКГ, а таксама мэдыкамі. Гэтыя структуры ўхіляюцца ад заключэньня дамоваў любымі магчымымі шляхамі. З абласнога ўпраўленьня МУС, як правіла, нам адказваюць, што будуць кіравацца законам аб масавых акцыях, а не рашэньнем гарвыканкаму, які патрабуе папярэдняга заключэньня дамоваў".



Аляксей Гаўруцікаў

Юрыст Аляксей Гаўруцікаў, актывіст аргкамітэту па стварэньні партыі "Народная Грамада", удакладняе: *"Мы спадзяваліся, што Саўмін унясе карэктывы ў рашэньне гарвыканкаму хаця б дзеля таго, каб прывесьці яго ў адпаведнасьць са сваёй жа пастановай. Існуе адмысловая пастанова наконт узаемаадносін грамадзян з органамі міліцыі. І ў выпадку арганізацыі масавых акцыяў гэтая пастанова прадугледжвае такі мэханізм: грамадзянін зьвяртаецца да мясцовых уладаў з заяўкай на пікет ці мітынг, і ўжо ўлады зьвязваюцца зь міліцыяй, каб тыя заключылі дамову з арганізатарамі. А ў Віцебску гарвыканкам загадаў грамадзянам зьвяртацца асабіста".*

Ухіліўшыся ад адказаў па сутнасьці, прадстаўнікі Савету Міністраў, здаецца, з уласнай ініцыятывы перадрасавалі зварот віцебчукоў у Міністэрства юстыцыі. Адтуль Хрыстафору Жаляпаву таксама прыйшоў ліст.


У лісьце гаворыцца, што мясцовыя ўлады могуць самі вызначаць парадак звароту па дазволы на вулічныя акцыі. Адзінае што прыйшлося канстатаваць у Мін'юсьце - дык гэта тое, што ў розных рэгіёнах прадугледжаны ўладамі парадак адрозьніваецца. Паводле выніках вывучэньня гэтай праблемы А. Гаўруцікавым, каля паловы мясцовых адміністрацыяў патрабуюць папярэдніх дамоваў, у тым ліку і зь міліцыяй, а палова патрабуе дамовы на абслугоўваньне акцыяў ужо пасьля таго, як яны будуць папярэдне дазволеныя.

"У лісьце зь Мін'юсту гаворыцца толькі, што добра было б унесьці нейкія зьмены і больш дакладныя фармулёўкі ў закон аб масавых мерапрыемствах. Але нічога не сказана, ці будзе міністэрства ініцыяваць гэтыя зьмены", - кажа Аляксей Гаўруцікаў.

Прадстаўнікі віцебскай грамадзкасьці ўпершыню зьвярнуліся ў Саўмін, каб адтуль распарадзіліся унесьці зьмены ў рашэньне гарвыканкаму. Ранейшыя спробы ініцыяваць гэты працэс былі беспасьпяховыя: з усіх інстанцыяў актывістам адказвалі, што рашэньне прайшло юрыдычную экспэртызу, зацьверджанае, а значыць прызнанае дасканалым.

Цяпер віцебскія актывісты абдумваюць магчымасьць зьвярнуцца наўпрост да Аляксандра Лукашэнкі, паколькі Прэзыдыюм Саўміну адмаўляецца рэагаваць на парушэньні сваіх жа пастаноў. Тым больш, што парушэньні зафіксаваныя па ўсёй краіне, і да кампаніі, распачатай актывістамі ў Віцебску, далучыліся прадстаўнікі рэгіёнаў і цэлыя грамадзкія структуры, напрыклад, партыя БНФ і рух "За свабоду".

Наймальнік напісаў скаргу сам на сябе?



Віктар Стукаў

У кнізе заўваг і прапаноў ААТ «Полацак-Шкловалакно» зьявілася скарга на парушэньне адміністрацыяй прадпрыемства ўказу прэзыдэнта. Скарга напісаная 23.07.2014 г. ад імя **старшыні Свабоднага прафсаюзу Віктара Стукава**. Пры гэтым, як сьцьвярджае апошні, 23 ліпеня кнігу яму на рукі ня выдалі, таму ніякага запісу ў ёй ён у той дзень не рабіў.

Пра дзіўны запіс у кнізе заўваг і прапаноў стала вядома з пастановы полацкага РАУС аб спыненьні адміністрацыйнай справы супраць службовай асобы ААТ «Полацак-Шкловалакно», які адмовіўся выдаць кнігу заўваг. У матэрыялах справы ёсьць копія старонкі кнігі, дзе пазначаная дата 23.07.2014 г. і зроблены запіс, што «парушаны ўказ прэзыдэнта аб звароце грамадзян і арганізацыяў», з подпісам старшыні прафсаюзу.

У пастанове аб спыненьні справы сказана: *«З пратаколу апытаньня Заціцрахіна В.Д. вынікае, што перашкод заяўніку ў выдачы кнігі заўваг і прапаноў ніхто не чыніў і Стукаў зрабіў запіс у кнізе заўваг і прапаноў 23.07.2014 году». Васіль Заціцрахін, згаданы ў пратаколе, зьяўляецца начальнікам аддзелу прававога забесьпячэньня ААТ «Полацак-Шкловалакно».*

Паколькі прафсаюзны лідэр 23 ліпеня так і ня здолеў атрымаць кнігу заўваг і прапаноў, значыць, запіс быў кімсьці сфальшаваны? Тым больш, што, як сьцьвярджае Віктар Стукаў, пісаць скаргу ён зьбіраўся зусім не пра парушэньне ўказу прэзыдэнта, а пра парушэньне «Закону аб прафэсійных саюзах» — пра перашкаджэньне службовай асобай наведваньня прадпрыемства прадстаўніком прафсаюзу.

23 ліпеня старшынём прафсаюзу была выкліканая міліцыя, і старшы ўчастковы Валер Іваноў склаў пратакол апытаньня аб парушэньні адміністрацыяй дэкрэту №2 «Аб удасканаленьні работы з насельніцтвам». Паводле гэтага дэкрэту ўпаўнаважаная асоба арганізацыі абавязаная прад'яўляць кнігу заўваг па першым патрабаваньні грамадзяніна. За парушэньне гэтага палажэньня прадугледжаны штраф службовай асобе ў памеры ад 4 да 10 базавых велічынь. Выходзіць, нехта ў адміністрацыі ААТ «Полацак-Шкловалакно» сфальшаваў скаргу на сябе, каб не плаціць штрафу?

Віктар Стукаў заявіў, што зьбіраецца абскардзіць пастанову міліцыі пра закрыцьцё справы вышэйстаячай службовай асобе ў віцебскае абласное ўпраўленьне ўнутраных спраў.

Наваполацкі актывіст аштрафаваны на 7,5 мільёнаў рублёў



Яўген Парчынскі

Наваполацкі суд 28 жніўня вынес рашэньне аштрафаваць грамадзянскага актывіста Яўгена Парчынскага. Памер штрафу склаў 7,5 мільёна рублёў. Суд прызнаў актывіста вінаватым у дапамозе работнікам заводу «Палімір» у атрыманьні фальшывых позваў у міліцыю, якія мусілі апраўдаць факт іх адсутнасьці на працы. Пракуратура спрабавала прыпісаць актывісту яшчэ шэраг парушэньняў закону, такіх як махлярства і падбухторваньне да дачы хабару, але ў судзе такія дзеяньні не знайшлі пацьверджаньня.

Крымінальную справу на Яўгена Парчынскага завялі ў Наваполацку яшчэ ў 2009 годзе, калі ён актыўна ўдзельнічаў у працы няўрадавых арганізацыяў. Пасьля актывіст займаўся перадвыбарнай агітацыяй за кандыдатаў у прэзыдэнты на выбарах 2010 году. Яўген пастаянна аказваў дапамогу людзям, якія трапілі ў цяжкія, а часам крытычныя сытуацыі.

Пракуратура Наваполацку ўвесь гэты час пастаянна спрабавала сабраць матэрыялы для крымінальнага перасьледу актывіста. Апошні раз міліцыя затрымала Яўгена Парчынскага напярэдадні апошніх паседжаньняў суду, адразу пасьля працы. У кайданках актывіста даставілі ў аддзяленьне міліцыі і, пратрымаўшы тры гадзіны, адпусьцілі без прад'яўленьня абвінавачваньняў.

Пракурор у судзе настойваў на пазбаўленьні волі абвінавачанага тэрмінам да трох гадоў з адтэрміноўкай выкананьня пакараньня на два гады. Відавочна, каб трымаць актыўнага грамадзяніна на «кручку» і каб была магчымасьць за малейшае правапарушэньне адправіць яго ў калёнію. Магчыма, суд вырашыў, што гораду не патрэбны ганебны факт «мясцовага палітвязьня», таму абышлося без арышту.

Яўген Парчынскі раней працаваў журналістам у наваполацкай газеце «Хімік», быў галоўным рэдактарам. У сувязі са сваёй журналісцкай дзейнасьцю мае вялікае кола сяброў і знаёмых у Полацкім рэгіёне. На судовых паседжаньнях падчас разгляду яго справы ўвесь час прысутнічалі знаёмыя і сябры Яўгена з грамадзкіх арганізацыяў Полацкага рэгіёну і Віцебскай вобласьці. Актывіст усім ім выказаў словы падзякі за падтрымку ў гэты няпросты для яго пэрыяд часу.

У Віцебску забаранілі пікет у падтрымку палітвязьняў



Леанід Сьвецік

4 жніўня ў Віцебску мусіў адбыцца пікет у падтрымку палітвязьняў. Аднак імпрэза, якую хацелі зладзіць праваабаронцы, не адбылася, бо мясцовыя ўлады правядзеньне акцыі забаранілі. Подпіс пад забаронай паставіла намесьніца кіраўніка адміністрацыі Чыгуначнага раёну Віцебску Натальля Ляпёшкіна.


«Лічу, што сыстэматычныя адмовы ў правядзеньні масавых мерапрыемстваў з боку улады ёсьць замах на фундамэнтальныя правы і свабоды. Такая палітыка не спрые разьвіцьцю грамадзянскай супольнасьці ды зьніжае палітычную актыўнасьць грамадзян», — пракамэнтаваў забарону пікету яго заяўнік **праваабаронца Леанід Сьвецік**.

Зрэшты, здаецца, менавіта зьніжэньне палітычнай актыўнасьці грамадзян і ёсьць мэтай віцебскіх уладаў, якія за апошнія некалькі гадоў не дазволілі ніводнай мірнай акцыі апазыцыйных палітыкаў і праваабаронцаў. Прычым, нагадаем, часам даходзіла да абсурду, калі забараняліся пікеты працягласьцю ўсяго ў адну хвіліну, альбо сустрэча грамадзян у гарадзкой лазьні, бо такія мерапрыемствы, на думку ўладаў, можна праводзіць толькі пры наяўнасьці дамоваў на іх абслугоўваньне з мэдыкамі, камунальнікамі і міліцыяй.

У Віцебску забаранілі пікет да 60-годзьдзя Лукашэнкі

Заяўку на акцыю ў адміністрацыю Кастрычніцкага раёну падаваў доктар Ігар Пастноў. Ён паспрабаваў выканаць усе патрабаваньні, рэглямэнтаваныя рашэньнем гарвыканкаму “Аб масавых мерапрыемствах у г. Віцебску", але дазволу так і не атрымаў.

У лісьце з Кастрычніцкай раённай адміністрацыі напісана, што патрабаваньні рашэньня гарвыканкаму №881 заяўнік выканаў ня ў поўным аб'ёме. Паводле Ігара Пастнова, ён зрабіў усё, што ад яго патрабавалася. Падаў заяўку на акцыю, але сутыкнуўся з даўняй праблемай арганізатараў масавых мерапрыемстваў — неадпаведнасьцю патрабаваньняў выканкаму рэальнай сытуацыі.



Ігар Пастноў

Ігар Пастноў: “Заяўнік мусіць прадставіць раённай адміністрацыі дамовы на абслугоўваньне пікету супрацоўнікамі ЖКГ, гарадзкой палікліНікай і міліцыяй. Я зьвярнуўся ва ўсе гэтыя структуры па дамовы, але станоўчы адказ атрымаў толькі ад камунальнікаў: прадпрыемства “Зелянгас", якое займаецца прыборкай гарадзкой тэрыторыі, заключыла са мной дамову".

“З палікліНікі мне адказалі дзіўна — што не займаюцца арганізацыяй масавых мерапрыемстваў, хаця я і не прасіў іх нічога арганізоўваць. Мне параілі зьвярнуцца ў раённую адміністрацыю — маўляў, акцыямі займаюцца яны. Накіравалі зноў туды, куды я і мусіў прадставіць дамову. Зь міліцыі адказалі яшчэ больш дзіўна: напісалі, што аховай правапарадку ў любой якасьці займаюцца без усялякіх дамоў, бо гэта прафэсійны абавязак міліцыянтаў. Такім чынам, з палікліНікай і міліцыяй, якія згаданыя ў рашэньні выканкаму як другі бок, зь якім трэба заключыць дамовы, супрацоўніцтва не атрымалася. Але — не па маёй віне, я зрабіў усё, што прапісана ў рашэньні аб арганізацыі масавых мерапрыемстваў", — распавёў Ігар Пастноў.

Ён зьбіраўся 30 жніўня або ў найбліжэйшы пасьля гэтай даты выходны дзень правесьці аднаасобную акцыю - выйсьці з плякатам “Дзякуй Бацьку за наша шчасьлівае жыцьцё!". Апрача гэтага, на плякаце ён хацеў разьмясьціць фотаздымак свайго разьлікловага квітка з сумай заробку, а таксама фотаздымкі палат у віцебскіх шпіталях.

Гэтая ідэя, відавочна, не магла быць упадабанай раённай адміністрацыяй. Але забаранілі акцыю не з ідэалягічных, а з фармальных прычын. З тых самых, што апошнімі гадамі пэрыядычна пералічваюцца ў забаронах іншым віцебскім актывістам, - на падставе адсутнасьці дамоў з мэдыкамі, міліцыяй і камунальнікамі.

Бюлетэнь “За правы чалавека” выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.